**Данута Бічэль**

# Дзявочае сэрца

вершы

Дзяржаўнае выдавецтва БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
МІНСК 1961

Данута Вічэль нарадзілася ў 1938 годзе ў вёсцы Біскупцы, Лідскага раёна, Гродзенскай вобласці, у сялянскай сям'і.

Скончыла Навагрудскае педвучылішча і цяпер вучыцца ў Гродзенскім педагагічным інстытуце імя Я. Купалы.

Вершы маладой паэтэсы друкаваліся на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Маладосць», «Полымя».

«Дзявочае сэрца» — першы паэтычны зборнік Дануты Бічэль,— па-моладу звонкі, поўны шчырай любові да роднага Прынёманскага краю, да нашых светлых дзён, да сціплага, працавітага чалавека.

## РАДЗІМА

Салома стрэхаў мохам перакрыта,
Хвайняк калгочы б'ецца пад рукой,
Загон курамі зблытанага жыта...
Цябе я змалку ведала такой.

Зашмыгаў мой кірпаты нос над міскай,
Вакол сінеў нязведаны прастор,—
А ўжо мне быстры Нёман стаў калыскай,
Стаў шалашом цяністы шэры бор.

Услед за статкам сярод буйных росаў,
На межах пальшовых, у журбе,
Зязюляй ранняй, перапёлкай босай,
Зусім маленькай зведала цябе.

Твае ля прызбы кветкі гадавала,
Праводзіла па Немане плыты...
Па імені яшчэ не называла,
Бо я не знала, што такое ты.

І песні трактароў, і шэпт калосся,
Віры бурлівай нёманскай вады —
Усё з маленства ў сэрца мне ўлілося,
А кроў мая была тваёй заўжды.

Ляцелі дні, мае дужэлі ногі,
Луналі сны трывожна па начах,
Даўжэлі змераныя мной дарогі,

І ты штодзень расла ў маіх вачах.

Здаецца, ўсюды маладзік двурогі...
Чаму ж такі прывабны родны кут?
Мяне завуць нязнаныя дарогі...
Пайду, а еэрца застанецца тут.

Пад лёгкім ветрам палавее збожжа,
Над галавою жаўранё дрыжыць...
Хто вырас тут, той не любіць не можа,
Табой не жыць, табой не даражыць.

**ПАВОДКА**

Зіхацяць, кіпяць, шугаюць хвалі;
Нёман вод сваіх змясціць не можа.
Мы, знямелыя, над кручай сталі:
О, які ты дужы і прыгоясы!..
Ты, як бацька, з намі ўсім дзяліўся,
Ты праз нашы сэрцы пераліўся.
Мы ў быстрынях набіралі сілы.
Тут з маленства крэплі нашы крылы.
Будзем жыць і жыць на гэтым свеце
Шчаснымі, упартымі заўсёды,
Бо ў жыццё нас блаславіў той вецер,
Што вясной твае калыша воды.
Давядзецца — ўправімся з бядою,
Сіл яшчэ на далей застанецца,
Бо зганяем стому той вадою,
Што ў краіне нёманекай завецца.

## ГРОДНЯ

Горад мой — бяссонніца мая!
Як жа не спяваць табе, скажы!
Свеціш ты краіне, як маяк,
На яе заходнім рубяжы.

З плеч сваіх не сцёр па сёння ты
Грозных дзён, пажарышчаў сляды,
Ды хачу я ў песні славіць тых,
Што цябе зрабілі маладым.

З імі поплеч вельмі добра мне
Новы я кварталы будаваць,
Мазалём гарачым саграваць
Кожную цагліну у сцяне.

Родны, старажытны, малады,
Сведка ўсіх маіх надзей і спраў...
Прагну я, 'каб гэтак і заўжды
Ты, як сёння ноччу, спачываў.

Спі... А я і Неман — удваіх —
Пастаім на варце сноў тваіх.

## РОДНАЕ СЛОВА

Пад казачным дубам, над Нёманам сінім
Хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукаўся між гаю:
— Кахаю, кахаю...
Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
Маё беларускае, роднае, кроўнае,
Такое раптоўнае, такое чароўнае,
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
Як сонца, агністае,
Як Нёман, празрыстае,
Як казка, быліна, як песня, жаданае,
Дагэтуль яшчэ у жыцці неспазнанае,
Гарачае слова ад шчырага сэрца!
Яно празвінела над хвалямі ў рэчцы,
Вятрыска шаптаў яго з лісцем між гаю:
— Кахаю, кахаю...
Шапталі яго сенажаць і дуброва,
Мільёнамі казана, тысячам нова,
Цудоўнае, дзіўнае, вечнае слова:
— Кахаю, кахаю...
Кахаю... Люблю... Беларускаму краю
Вясконда я слова «люблю» паўтараю.
Калоссям жытнёвым, у шчырых размовах,
Вялікім будовам і шчырым размовам,
Краіне Саветаў, авеянай славай,
Усім, хто душой за народную справу;
Палеткам калгасным, зялёнай дуброве
Кажу гэта слова на матчынай мове.

* * *

Многім цёпла ў бацькі пад страхою,
А мяне сагрэе шум жытнёвых ніў.
Змалку сэрцу не даюць спакою
Ў сініх далях ясныя агні...
Я на радцарожжы не зблуджуся
І не збочу, каб чакаць падмогі.
Па шляхах зялёных Беларусі
Буду пракладаць свае дарогі.

**ПЕСНЯ ЛЕСУ**

У сінім лесе ды напрадвесні
Я ўчула песню, лясную песню.
Яе старая сасна спявала,
Мне песня сэрца зачаравала.
Яе пачатак ціхуткі, кволы,
Над першай краскай звінелі пчолы.
А падхапілі лісткі бярозы,
Лясныя птахі, начныя росы,
Закукавала ў кустах зязюля,
Усе вяснянку вакол пачулі.
Шумелі нушчы, звінелі хвалі,
Запелі з ветрам лугі і гоні...
Яна лунае ўсё далей, далей,
І толькі думка яе дагоніць.
Праз горы-долы, гаецінцам веснім
Іду, імкнуся, бягу за песняй.

* * *

Сягоння слоў прыгожых не кажы —
Няма ў жыцці прачулых слоў такіх.
Вазьмі маю руку, і пабяжым,
І пабяжым удвух, як ручайкі.

Куды? Ці не ўсё роўна нам куды?
Туды, дзе лад вядзе вясна сама,
Дзе толькі звон, разбуджанай вады,
Дзе іншых воч няма.

Гамоніць лес, вітаючы здаля,
Гракі крычаць бясконца ў галлі...
Прыслухайся, як дыхае зямля...
Увачавідкі вербы расцвілі.

У сакавіцкай сіні высь, і дол
Ўсхвалёванаму сэрцу ў такт пяе,
А ўсё такое светлае вакол,
Як вочы любыя твае.

* * *

Ціхутка зорку з далёкага неба
Нёман на хвалях калыша.
А мне гэтай цішы
Сёння не трэба...
Даволі мне гэтай цішы!
Даволі крочыць
Зоркай па ночы,
Месяцу пасміхацца^
Хачу абмыцца
Пад гул навальніцы
Потам гарачай працы...
Толькі у працы
Сіл набяруся,
Новай песняй зноў загаруся,
Толькі над гром,
Красавіцкі, першіл,
Будуць звінець мае вернгы.

## БАЛАДА ПРАВАДОЎ

Як іду стараной,
Дзе зазвоняць струной
Правады,
Што пяюць і пяюць
Нескончоную песню сваю,
Уваччу прада мной
Паўстае
Постаць творцы яе.
Ён, чапляючы струны ў цішы,
Вырываў гэту песню з душы
І ўкладаў яе назаўжды
У цымбалы шляхоў — правады.

Быў ён, гэты цудоўны творца,
Звычайным бялявым хлопцам.

Дзе ён пройдзе калгасным сялом
Азараюцца вокны святлом,
Асвятляецца кожиы ларог,
Ноч, як воўк, уцякае з дарог...
Пройдзе ён — і над шолахам ніў
Вырастаюць у рад слупы,
Усміхаюцца людзям агні...
Ён не проста мантажнікам быў,
Ён быў сынам тых мірных сяліб,
Што ў яго на шляху ляглі,
Тых зямель, па якіх. ішоў,—
Іх крупінкаю быў, іх душой.

Гэта ў кожным метры шляхоў
Частка сэрца гарэла яго,
Сам ён полымна, ясна гарэў.
А калі каханне сустрэў
Той асілак з дзіцячай душой,
Каб адкрыцца, сіл не знайшоў.
Нават слова прамовіць не мог
Электрычны чубаты бог.
Неяк ціха і без надзей
На яе прыгажосць глядзеў...
Абарваўся ў пачатку той гімн,
Бо забраў яго шчасце . другі...
Тыя ж словы, што ў час не сказаў,
Што каралямі ў сэрды нізаў,
Ён панёс... Ён панёс у палі,
Дзе цымбалы шляхоў гулі. .
Іх запелі усе правады,
Што наструніў хлапец малады.
Ён далей сваім шляхам пайшоў,
Засмучоны душой,
А за ім ад сяла да сяла
І трывожная песня пайшла.

* * *

У студэнта і дзень вялікі,
Калі здадзены ўсе залікі.
Зноўку цеснымі вуліцы сталі,
Едзь, куды цябе вабяць далі!
Нават месяц з табой смяецца,
І пачуцці ў грудзях не месцяцца,
Заляцеў бы, як птушка, здаецца,
Без ракеты на крыллях да месяца.

**ПОЛЬКА**

У калгасе сёння свята:
Падружыла з нівай хата,
Повен клуб, гасцей багата,
Весялосці колькі!
Рвуцца ў высі агнявыя,
Беларускія, жывыя
Трапятухі-полькі.

Шырай дзверы, шырай дзверы!
Колас просіцца ў кватэры.
Насыпайце поўнай мерай
Залатое збожжа.
Святу светламу ўраджая
Бестурботная, жывая
Полька дапаможа.

Тут жанаты й нежанаты.
Звонкіх песень рой крылаты.
Пасылайце ўвысь, дзяўчаты,
К зорам адгалосак!
Гарманіст жа налягае..
Баявая, агнявая
Полька родных вёсак!

## ВЁСКА БІСКУПЦЫ

Каб у стозе духмяным выспацца,
Я паеду ў мурожныя Біскупцы —
Пад страху дываноў саматканых,
На прасторы палёў курганных.

Буду ехаць бітым гасцінцам —
Выйдзе з бору сасна пакланіцца,
Зашапоча бярозка з аддалі
Накрухмаленай сукняй з паркалю.
Нават бусел над дужым дубам
Рабіве, вітаючы, дзюбам.

А ў матулі стол не пустуе —
Чым багата, тым і частуе:
Пірагом, верашчакаю, сырам,
Ды смятанай, ды позіркам шчырым.

Не спачыўшы, выбегу з хаты,—
Новай песняй частуюць дзяўчаты.
Добрым жартам, зварушлівым слоўцам
Сустракаюць аднавяскоўцы.

Тут мне ўсё наваколле смяецца
Смехам зор і рамонак з лугоў.
Неман тут не цячэ, здаецца, •
А танцуе ламіж берагоў.

## РАНІЦА

Раней за сонца ўстану рана я.
Такое ранне не праеплю.
Прайдуся росамі, крамяная,
Улюблёная ў сваю зямлю,
І пабягу з вятрамі гонкімі
Па ўсіх шляхах зялёных —
Суетрэне луг мяне рамонкамі,
А поле — сінню лёну.
А лес грыбамі запалоніць:
Лісіц — грабі ў ахапкі,
Баравікі ў зямным наклоне
Скідаюць самі шапкі.
Я за чарніцамі-усмешкамі
Залезу у гушчэчу...
Унізе пахне сыраежкамі,
А зверху птах шчабеча.
Паабтрасаю росы з голля
І выбегу на ўзлессе...
Абсыпана густое поле
Жаўруковай песняй.
Ліецца песня з-пад блакіту
На жыта, ўсё на жыта,
Жывое серабро нібыта,
Як я, расой абмыта.
Усё спявае і смяецца,
І так навокал светла,
І можна абысці, здаецца,
За сонейкам паўсвета.

* * *

Ані груш, айі сліў
Мне мой любы не насіў,—
Мне каханы мой дарыў
Ўсе пратталінкі ў бары,
Адгалоскі вясны,
Пах смалістай сасны,
Верасы,
Сітнягі,
Заліўныя берагі,
Ды шаўковыя імхі,
Ды ружовыя шляхі...
Падарыў лясны ручэй
Усе зоранькі начэй,
Салаўіныя гаі,
Пацалункаў — на дваіх...
І вясёлкі з нябёс
У вачах сваіх прынёс.

Ды змаўчаў, што прынясе
І маланкі ён усе.

* * *

Заблудзіўся маладзік сп'янелы
Ў задуменных дрэвах каля гаю.
Там пявунні нейкія нясмела
Салаўям залётным , падпяваюць.

Воддаль у гурток хлапцы сышліся,
На спявачак косіць вока кожны.
Гэтакія ночы пачаліся,
Што ні опаць, ні сумаваць няможна.

Як туман над ранак абаўе
Таямніча сцежкі між гаямі,—
Паспаборнічаем з салаўямі:
Хто тады з нас лепей запяе!

## НА НАЧЛЕЗЕ

Толькі драч у лесе
Ўсё з мяне смяецца,
Маладзік далёкі
Выглянуў і згас.
Коні, мае коні,
Што ў мяне на сэрцы,—
Расказаць нялёгка
І для вас.

Любая дзяўчына —
Бачыў я сягоння —
Горача смяялася з другім.
І пайшлі ціхутка...
Коні, мае коні!
Асталіся вы ды мурагі.

Марыў адружыцца
У радасці і шчасці.
Без яе і дзень,
Як уначы.
Коні, мае коні!
Лепш бы мне прапасці..
Сэрца раздзярыце мне,
Драчы.

## ЦЯЛУШКА

Нейк маю цялушку
Пакусалі мушкі.
А цялушка праз платы
Ды як пойдзе на кусты.
Я гукала яе...
Я шукала яе...
Я аббегала палі ўсе,
Ручаём з мяне пот ліўся.
— Дзе ты скачаш праз галлё,
Неразумнае цялё!

Улезла ў самае балота
Рыжая мая блазнота.
Стала. Нюхае чарот —
Нешта незнаёмае...
Як «заплача» на ўвесь рот:
— Му-у-у! Хачу дадому я...

* * * .

Ты за вёрсты хаваешся назнарок,
Нават весткі падаць не хочаш,
Але ведай: днём або ўночы
Да нявернасці зробіш хоць крок —
Я заўважу яго...
Я пачую яго, мой дружа,
Мне ўсе ластаўкі верна служаць:
Закрыляюць, заб'юць трывогу,
Зашчабечуць яны над страхой
І пакажуць тую дарогу,
Па якой ты пойдзеш к другой.
Ты саб'ешся з тае дарогі —
Бо месік над лесам двурогі,
Што маім сябруком завецца,
На той час у хмару заб'ецца...
Зоркі ў небе зажмураць вочы,
Будзе цёмна і страшна ноччу,—
Ты не знойдзеш дарогі...
А як пойдзеш пры сонцы па свеце,
Я паклічу паўночны вецер.
Ён узніме пясок на полі,
Запарушыць сінія вочы...
О, ты больш у жыцці ніколі
Па тых сцежках хадзіць не.захочаш.
А як ранкам тая, другая,
На сядзібу сама прыбяжыць,
Дык зязюля з роднага гаю
Паідцікуе яе на мяжы.
Закукуе яна галосна,
Ўсіх сябровак маіх разбудзіць,
А яны бязлітасна, злосна
Разлучніцу тую асудзяць.

## СЭРЦА ДЗЯВОЧАЕ

Цэлы дзянёк да працы дасужая
Жыта вязала, сена зграбала,
Ногі самлелі, рукі знядужалі,—
А сэрцу, а сэрцу ўсё мала.

У Нёмане змыла стому-нягодніцу,
З лесу прынесла грыбоў у прыполе.
Змрок, крадучыся, паўзе за ваколіцу...
Сэрца сціскаецца:
                    — Болей!

І пацягнула яно, невыноснае,
Млечнай дарожкай па ночы...
— Час бы дамоў,— збажына шэпча росная.
Сэрца вяртацца не хоча...

Вёска засне, перапёлка ўгамоніцца,
На'т вецярок здрамнуў у тапалі.
Сэрца! Калі ж ты прагоніш бяссонніцу?
Сэрца грукоча:
              — Ніколі!

* * *

Ночка крые берагі
      і ваду,
Ты паклічаш, дарагі —
      я прыйду.

Непакорны чорны чуб
      расчашу,
А пра тое, як мне люб,—
      не скажу.

Безліч зор глядзіць з вышынь
      на зямлю...
Мо' лічыць іх у цішы
      я люблю?

Неман лашчыць, нібы ў сне,
      чараты...
Можа, ён пазваў мяне,
      а не ты?

* * *

— Мая,— крычаў ты ўсхвалявана мне.
— Мая...— пацвердзіў рэхам шчыры бор.
— Мая...— вятры панеслі на прастор...
І дзяцел штамп паставіў на сасне.
...Ніякіх заклінанняў не кажы.
Каханне нарадзілася вясной.
І як вясна, я веру, будзе жыць,
Пакуль сінее неба нада мной,
Пакуль звіняць разгульныя вятры,
Пакуль не, моўкне рэха у бары...

**ДЗВЕ СЯСТРЫЧКІ**

Дзве дзяўчынкі разам ходзяць,
Рвуць цыбульку ў агародзе,
Дзве маленькія сястрычкі,
Залаценькія касічкі.

Праца радуе дзяўчынак:
То яны накормяць свінак,
То пасуць цяля за плотам,
То ўзбіраюцца на дрэвы,
То давай заводзіць спевы,—
Ды ці ж мала ёсць работы?

Іх пабітыя каленкі,
Іх парваныя сукенкі,
Шчочкі сонцам маляваны,
А насочкі ўверх задраны.

Небам свецяцца іх вочкі.
Загарэлыя лабочкі.
От яны пабеглі ў поле —
Неразлучныя ніколі.

* * *
Смуглатварай, сінявокай
Варта толькі падрасці —
Ад прахожых абібокаў
Супакою не знайсці.
Ходзяць следам
З хаты ў хату,
Сцерагуць з-за куетоў,
Высылаюць сватоў.

Але тая страказа
Ім падносіць гарбуза:
— Покуль носіш гультая
У блішчастым боце,
Прыгажуня не твая,
Не твая, і годзе!

**ПРА БЯДУ І КАЛЯДУ**

Маці мне расказвала пра дзеда:
Усё жыццё ён марыў стаць багатым.
Скалясіў за доляю паўсвета
І, абшэрпаны, вяртаў дахаты.
Браўся зноў за плуг і барану,
Лямку бедака далей цягнуў.
Час ішоў — раслі на латах латы...
Гэтак і не стаў мой дзед багатым.

Але быў за ўсё жыццё выпадак
Невялікім постам пад каляды,
Што ажно суседзі загулі ўсе,
Думалі: Адам свайго Дабіўся.
Дзед сабраў паўвёскі ў грамаду:
— Закалоць бо маю каляду.
Дык прашу, браткі, не адкажыце,
Сам бо не асілю. Дапамажыце...

Просіць чалавек, дык то ж спрадвеку
Паважаюць просьбу чалавека.
— Як тут да Адама не пайсці? —
І прыйшло мужчын да дваццаці.
Тут яшчэ й цікавасць у людзей —
Што ж за вепрука ён даглядзеў?
Нехта ж з маладзіц паспеў дазнацца,
Што пудоў не меней як семнаццаць...
Поўна хата. Дзед тады звярнуўся
Да сваёй кабеціны Францусі:

— Бачыш, баба, што чакаюць людзі,
Дык чаго, надзьмуўшыся, марудзіш?
...З рук жанчыны спрытна чапяла
Иедзе за падпечак папаўзла.
Вырачыла вочы грамада —
Аж адтуль вылазіць каляда.
У кутку мятлой прыкрыта смецце,
Вепручок там сховішча прыкмеціў,—
Шуснуў ён, гарбаценькі, туды:
З-пад мятлы не бачна каляды...

Хоць гібеў без хлеба любы дзед —
Весяліў, бывала, белы свет.

* * *

Хіба праўданькі ні слова
Ты мне не сказаў,
Хіба Нёман раптам з мора
Пацячэ назад...
Хіба сосны з бору самі
Пабягуць у свет
І гарачыя крыніцы
Пацякуць услед...
Промень сонца сінім раннем
Не сагрэе нас,
Светлы май з сваім убраннем
Уцячэ на Марс...
Хіба чэрвеньскія зоры
Ападуць усе...
Хіба ты мне адно гора,
Слёзы прынясеш...
Хіба бульба ў Беларусі
Вырадзіцца ўся,
А ў калёсы замест коней
Запрагуць гуся...

Хіба выспеюць узімку
Вішні на вярбе...

І тады кахаць я буду,
Добранькі, цябе.

* * *

Лёгкія сняжынкі у цішы
Долу апускаюцца нясмела...
Светла ў полі, светла на душы...
Лёгкія сняжынкі у цішы...
Спіць сасна ў бахматым шалашы,
А навокал так бялютка-бела...
Лёгкія сняжынкі у цішы
Долу апускаюцца нясмела.

**ЕЛАЧКІ**

Елачкі-яліначкі
чубатыя,
А на іх — сняжыначкі
бахматыя.

Паднімі галінку-
бахматку —
Пападзеш у зайчыкаву
хатку.

## ПЕРШАЯ ЛЫЖНЯ

Падвойныя нацягваем пальчаткі,
У каўняры захутваем насы…
Давайце яе сустракаць зіму, дзяўчаткі,
Як су страна лі ў даўнія часы,

Хвіліна, дзве… З вятрамі мы ў паходзе,
— Навыперадкі!
— Я пераганю!
На першую лыжню у гэтым годзе!
На камсамольскую лыжню!

Злуй, завіруха! Снег мяці, круці,
Сячы нам вочы, засыпай сляды!
Імкніся кожны, сэрцам малады,
Свае заўсёды пракладаць пуці.

* * *

Пайду я напрасткі па цаліне,
Забыўшы шумны горад, у паход.
Аслепіць снегавая бель мяне,
Закруціць завіруха ў карагод.
Застогнуць сосны стылыя ў журбе.
Снягі, снягі… Маўклівыя палі.
Адны снягі і вецер на зямлі,
І я, непадуладная табе.
Я буду на марозе сэрда грэць
І тандаваць на снегавым таку…
Я, злосная, смяяцца буду, пець…

Я ад твайго кахання уцяку.

**БЯРОЗА**

Снежная пустэча.
Бель у вочы коле...
І адна бяроза —
Вартаўніца поля.

Лёгкадумны вецер
Між галін смяецца,
Хоча запалоніць
Белакосай сэрца.

Хоць бярозу вабіць
У даль начную зорка,
Стыне, не пакіне
Роднага пагорка.

* * *

Можа, прыйдзе калі чарга
І мне як паэту праслвіцца,—
Я аддам сваю славу лугам
І наднёманскай раніцы,
І хлапцам, што ганяюць плыты
Па шалёных вірах за паўсвета...

Гэта — нёманскі нораў круты,
Гэта — сэрца, што песняй сагрэта.

* * *

Абмыты хмельнай пенай,
Бушуе грозны Нёман.
Глядзі на шыр разліву
І слухай гнеўны гоман,
Спазнай, якія сілы
З сабою ён нясе
У бязлітасным разгоне,
У нязведанай красе,
Змятаючы з дарогі
Каменні і платы.
О, колькі, колькі моцы
У грукаце вады!
Ты ўздрыганеш, зірнуўшы
На хвалі ў непагоду.
А паспрабуй хто-небудзь
Пазбавіць нас свабоды,—
Людскія сілы гневу
У стократ мацней за воды.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## ЗМЕСТ

Радзіма
Паводка
Гродня
Роднае слова
*** Многім цёпла ў бацькі пад страхою
Песня лесу
*** Сягоння слоў прыгожых не кажы
*** Ціхутка зорку з далёкага неба...
Балада праўдаў
*** У студэнта і дзень вялікі
Полька
Вёска Біскупцы
Раніда
*** Ані груш, ані сліў...
*** Заблудзіўся маладзік сп'янелы...
На начлезе
Цялушка
*** Ты за вёрсты хаваешся назнарок
Сэрца дзявочае
*** Ночка крые берагі
*** — Мая,— крычаў ты ўсхвалявана
Дзве сястрычкі
*** Смуглатварай, сінявокай
Пра бяду і каляду
*** Хіба праўданькі ні слова
*** Лёгкія сняжынкі у цішы
Елачкі
Першая лыжня
*** Пайду я напраcткі па цаліне
Бяроза
*** Можа, прыйдзе калі чарга
*** Абмыты хмельнай пенай